**Р. А. Зарэцкі**

# РОЛЯ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ У ЕЎРАПЕЙСКАЙ ГЕАПАЛІТЫЦЫ (16–18 ст.)

Рэч Паспалітая амаль заўсёды падчас свайго існавання заставался гігантам усходнееўрапейскай палітыцы, і далей, нават пасля свайго знікнення, пряцягвала ўплываць на фарміраванне Еўропы. Сумесная дзяржава Польшчы і ВКЛ некалькі разоў выратоўвала Стары Свет ад пагрозы заваявання, аднак не змагла даць адказ на ўнутраныя і знешнія выклікі 17 і 18 ст. і, у выніку, была падзелена паміж больш моцнымі суседзямі.

Можна вызначыць некалькі кірункаў геапалітычнай актыўнасці Рэчы Паспалітай. У першую чаргу – барацьба супраць асманаў. Мяжы краіны якраз сутыкаліся з ісламскім светам поўдні дзяржавы. Гэта рабіла даволі цяжкім вайсковыя дзеянні ў напрамку Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропу з боку стэпаў. Адной з найбольш значных вайсковых падзей стала аблога Вены ў 1683 годзе, калі крылатыя гусары войска Рэчы Паспалітай на чале з Янам Сабескім разбілі шматтысячную армію Асманскай Імперыі, выратаваўшы не толькі Вену, але і ўвесь астатні хрысціянскі свет. Кааліцыйнае войска еўрапескіх краін уяўляла сабой шматнацыянальную армію са ўсёй Еўропы, воіны якой біліся не за сваіх каралёў ці нейкія палітычныя інтрыгі, а за сваю веру. У выніку пасля гэтай паразы пачаўся заняпадак асманаў. І сама “рэспубліка двух народаў” у апошні раз перажыла ўзлёт як вялікая дзяржава.

З усходняга флангу у Рэчы Паспалітай быў яшчэ адзін моцны канкурэнт – Маскоўскае Царства, якое за некалькі стагоддзяў стала цэнтрам збірання зямель Русі ва Ўсходняй Еўропе, і ў канцы 18 ст., умела выкарыстаўшы знешнія і ўнутранныя няўзгоды суседа, разам з Прусіяй і Аўстрыяй прыняла актыўны ўдзел у ліквідацыі дзяржавы.

Крызіс Рэчы Паспалітай пачаўся з унутраных канфліктаў 17 ст., з паўстання Багдана Хмельніцкага. Літаральна некалькі гадоў пасля пачалася разбуральная вайна з тады ўжо Рускім Царствам і Швецыяй. Гэты перыяд вядомы ў польскай гісторыяграфіі як “патоп”. Пасля вайны амаль уся краіна ляжала у руінах, загінула амаль палова насельніцтва. Але нават пасля такога лёс працягнуў насылаць разбуральныя войны разам з унутранымі канфліктамі. Толькі ў 1650-я гг. было ўпершыню выкарыстана “liberum veto”, якім потым пачнуць карыстацца суседнія дзяржавы, паралізваўшы працу сойма. З часам Рэч Паспалітая ператварылася толькі ў жаласнае падабенства на сябе і ўжо ніколі не вярнулася на мапу Еўропы, якая амаль і не памятае такую вялікую дзяржаву, што адыгрывала часам вызначальную ролю ў тагачасных геапалітычных працэсах.